ПРАЛЕТАРЫІ УСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# Беларускі універсітэт

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА І ПРАФКОМА БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

№ 3 (1001) ● ЧАЦВЕР, 1 лютага 1973 г. ● Цана 2 кап. ● Год выдання XXXVIII

## ЭСТАФЕТУ СЕСІІ ПРЫНЯЛІ ЗАВОЧНІКІ

## У ВУЧОНЫМ САВЕЦЕ

Чарговае пасяджэнне вучонага савета адбылося на гэты раз у хуткім часе пасля заканчэння ўсесаюзнай нарады работнікаў вышэйшай школы ў Маскве, на якой прысутнічалі рэктар нашага універсітэта У. М. Сікорскі, сакратар парткома Т. Я. Дударава, дэкан біялагічнага факультэта Ю. К. Фамічоў. І перш чым прыступіць да абмеркавання пытанняў парадку дня, члены савета заслухалі інфармацыю Усевалада Міхайлавіча Сікорскага аб прайшоўшай нарадзе. Ён адзначыў найбольш важныя праблемы, аб якіх ішла гаворка — аб больш цеснай інтэграцыі навукі і адукацыі, ператварэнні універсітэтаў у сапраўдныя навукова-метадычныя цэнтры, хуткай падрыхтоўцы кадраў па новых спецыяльнасцях, узмацненні матэматычнай падрыхтоўкі, аб вучэбных планах і размеркаванні маладых спецыялістаў, ролі грамадскіх навук і ўсім комплексе палітыка-выхаваўчай работы і г. д., — сканцэнтраваў увагу на сучасных задачах вну і ў прыватнасці універсітэцкіх калектываў, расказаў аб карысным вопыце, якім падзяліліся ўдзельнікі нарады.

Затым з дакладам аб выніках прыёму ва універсітэт у 1972 годзе і задачах па падрыхтоўцы да новага прыёму выступіў прарэктар па вучэбнай рабоце С. А. Умрэйка.

Аб выкананні плана павышэння кваліфікацыі прафесарска - выкладчыцкага саставу, выкананні плана прыёму ў аспірантуру і мерах паляпшэння работы аспірантуры далажыў прарэктар па навуковай рабоце Л. В. Валадзько.

Прарэктар па адміністрацыйна-гаспадарчай рабоце С. А. Ерамееў расказаў аб тым, што робіцца ў БДУ па далейшаму паляпшэнню матэрыяльных і жыллёва-бытавых умоў студэнтаў.

## ПРАЦА І ВУЧОБА ПОБАЧ

Вось і засталіся ззаду гады вучобы ва універсітэце. Прыемны сум ахоплівае цябе, калі пачынаеш успамінаць усе гэтыя гады ўпартай, настойлівай і разам з тым шчаслівай працы. Думаецца, што кожны з нас вынясе ў сваім сэрцы часцінку нашага вялікага, разумнага, слаўнага універсітэта. Ён жа невычэрпны! Тут пазнавалі таямніцы навукі тысячы людзей з самых розных месц краіны. Сардэчную ўдзячнасць выказваюць студэнты-завочнікі і выпускнікі 1973 года аддзялення біялогіі вялікаму выкладчыцкаму саставу універсітэта. Ён дапамог нам авалодаць разуменнем усёй сістэмы выхаваўчага навучання, веданнем асноў працэсу выкладання біялогіі з тым, каб умела выкарыстаць іх у сваёй працы.

Праца ў школе і вучоба ва універсітэце ўзаемна дапаўняюць адно другое. Універсітэт не толькі папоўніў наш узровень ведаў па тэарэтычных пытаннях, але і вырашыў тым самым многія пытанні педагагічнай практыкі. Больш упэўнена ідзеш на ўрок, цікавей можаш арганізаваць пазакласнае мерапрыемства, работа на вучэбна-вопытным участку становіцца больш цікавай. Так, прадмет селекцыі раслін дазваляе закласці з вучнямі шэраг цікавейшых доследаў і на іх аснове прыйсці да складаных вывадаў. І праца на кафедры сістэматыкі раслін, і вывучэнне фізіялогіі і біяхіміі раслін, і падрабязнае знаёмства з заалогіяй пазваночных і беспазваночных жывёл, і іншыя навукі—усё гэта тое, без чаго настаўнік у школе не настаўнік, таму што настаўніку біялогіі неабходна ведаць увесь ход навучання па цыклу біялагічных навук.

Я была б шчаслівай, калі б мае выхаванцы аказаліся добрымі студэнтамі БДУ.

**Я. ГАЎРЫС,**
**студэнтка - завочніца VI курса аддзялення біялогіі.**

## НА РАЗВІТАННЕ

Апошняя сесія. Цяжка ўявіць, што вучоба ва універсітэце, які стаў ужо па-сапраўднаму родным домам, хутка завершыцца. Таму і не верыцца, што яшчэ будуць сустрэчы з выкладчыкамі, тры экзамены. Апошнія. Цішыня калідораў такая, якая бывае толькі ў сесію. На дзвярах аўдыторый надпісы: «Цішэй, ідзе экзамен!». І гэтае старое студэнцкае папярэджанне заўсёды падтрымліваецца ў перыяд сесіі. Праўда, да той пары, пакуль з аўдыторыі не выскачыць «запараны» студэнт. І незалежна ад таго, які ў яго выраз твару — засмучаны або ззяючы, — яго сустрэнуць градам пытанняў. І цяпер ужо, у залежнасці ад выніку, адзін адмахнецца і панура пабрыдзе ў вугал, акружаны толькі маўкліва-спачуваючымі, другі з захапленнем пачне расказваць, што здаваць вельмі лёгка, хоць яму і пашанцавала з білетам.

Знаёмая карціна, якая паўтараецца два разы ў год. І калі раней гэта хвалявала і напаўняла душу, незалежна ад аб'ёму ведаў, няўпэўненасцю ў сабе, то цяпер гэта здаецца нечым наіўна-мілым, як адыходзячае дзяцінства. Было ўсё. Цяпер з вышыні пройдзеных пяці год смешна ўспамінаць страх перад кожным экзаменам: «Нічога не памятаю, нічога не ведаю...» А пасля кожны раз аказвалася, што нешта памятаеш, нешта ведаеш. З нейкім шкадаваннем адкладваеш у бок непатрэбныя ўжо вузаўскія падручнікі. І кожны напамінае аб чарговым этапе студэнцкага жыцця.

У канцы студэнцкага шляху па-іншаму ўсведамляеш усё, што было дрэннага і добрага. Быў і ўдзел у конкурсах навуковых студэнцкіх прац, і навуковыя канферэнцыі, выступленні на якіх па сутнасці былі першымі крокамі на шляху ў навуку. Успамінаюцца прасторныя аўдыторыі, знаёмыя і незнаёмыя твары, гутаркі з цікавымі людзьмі. Напрыклад, сустрэча з доктарам геаграфічных навук О. Е. Агаханянцам — даследчыкам раслíннасці высакагор'яў Сярэдняй Азіі. Ад гэтых сустрэч засталося жаданне прысвяціць усё жыццё навуцы, вывучэнню якой ужо аддадзены лепшыя гады юнацтва.

Азірнуўшыся на адыходзячыя студэнцкія гады, хочацца сказаць вялікае дзякуй тым людзям, якія павялі цябе па цікаваму шляху навукі і дапамаглі ў выбары спецыяльнасці, якія, не шкадуючы сіл і энергіі, прывівалі табе любоў да ведаў.

І некалі настуніць момант, калі, ацаніўшы збоку студэнцкія гады, падумаеш — вось гэта трэба было б зрабіць не так, а вось гэта было сапраўды добра... І ў выніку, як кожны, хто пражыў шэсць год у неўгамонным і нястомным студэнцкім асяроддзі, прыйдзеш да вываду — ніколі не забыць студэнцкіх песень, вясёлых кастроў у час летняй біялагічнай практыкі, хваляванняў перад аўдыторыяй і цудоўнага адчування лёгкасці пасля ўдачна здадзенага экзамена.

**В. МАЎРЫШЧАЎ,**
**студэнт VI курса аддзялення біялогіі.**



У выпускнікоў аддзялення матэматыкі лекцыя па спецкурсу. Чытае яе дацэнт **Ф. В. Чумакоў.** Фота **Д. Чаховіча.**

## 93-я КАФЕДРА

У корпусе хімічнага факультэта размесціцца кафедра марксісцка-ленінскай філасофіі прыродазнаўчых факультэтаў.

Рашэнне аб раздзяленні існаваўшай раней кафедры марксісцка-ленінскай філасофіі на дзве — гуманітарных і прыродазнаўчых факультэтаў — прынята з мэтай паляпшэння вучэбнай, навукова-даследчай і палітыка-выхаваўчай работы. Узначаліў кафедру марксісцка-ленінскай філасофіі прыродазнаўчых факультэтаў доктар філасофскіх навук прафесар Васіль Іванавіч Сцяпанаў. Кафедры даручана весці работу на факультэтах: фізічным, хімічным, біялагічным, геаграфічным, матэматычным, прыкладной матэматыкі, спецфакультэце прыкладной матэматыкі, завочным.

Кіраўніком кафедры марксісцка-ленінскай філасофіі гуманітарных факультэтаў выбран па конкурсу доктар філасофскіх навук, прафесар Георгій Пятровіч Давыдзюк. Калектыў гэтай кафедры будзе весці работу на факультэтах: гістарычным (з аддзяленнямі філасофіі і палітэканоміі), філалагічным, журналістыкі, юрыдычным, завочным (па спецыяльнасцях, якія ёсць на пералічаных факультэтах).

Народны кантроль

## НА ПАРАДКУ ДНЯ — ГРАМАДСКАЕ ХАРЧАВАННЕ

У кастрычніку — снежні 1972 года сектарам быту групы народнага кантролю універсітэта правяралася работа сталовых і буфетаў універсітэта. Вынікі праверкі заслуханы на пасяджэнні бюро універсітэцкай групы народнага кантролю, у якім актыўна ўдзельнічалі работнікі санстанцыі Кастрычніцкага раёна г. Мінска А. І. Шыманскі і Р. І. Прымакова, старшыня камісіі па грамадскаму харчаванню мясцкома універсітэта Н. І. Юзафовіч, загадчыца сталовай № 33 Т. А. Трайнова, а таксама прадстаўнікі адміністрацыйна - гаспадарчай часткі, камітэта камсамола, прафкома і «Камсамольскага пражэктара».

У працэсе праверкі было ўстаноўлена, што работнікі сталовых і буфетаў, дзе харчуюцца студэнты, супрацоўнікі і прафесарска-выкладчыцкі састаў, стараюцца палепшыць якасць страў, павысіць культуру абслугоўвання і дабіліся пэўных поспехаў. Аднак побач са станоўчымі фактамі у іх рабоце ёсць і сур'ёзныя ўпушчэнні і недахопы, якія выклікалі шэраг істотных папрокаў і скаргаў, абумоўленых як нядобрасумленнымі адносінамі да работы асобных супрацоўнікаў сталовых і буфетаў, так і цэлым радам аб'ектыўных прычын, а іменна: адсутнасцю неабходнага асартыменту прадуктаў, недастатковым іх завозам, недахопам бытавых, дапаможных і іншага тыпу памяшканняў у некаторых сталовых і буфетах, недастатковай колькасцю пасадачных месц (асабліва ў буфеце галоўнага корпуса) і г. д.

Свой адбітак на работу пунктаў грамадскага харчавання ва універсітэце накладвае іх рознае ведамаснае падпарадкаванне. Палова пунктаў грамадскага харчавання абслугоўваецца сталовай № 33, якая базіруецца ў інтэрнаце № 5 па вуліцы Кастрычніцкай. Усе заўвагі, выказаныя ў адрас гэтай сталовай, прызнаны правільнымі, і цяпер прымаюцца ўсе меры па наладжванню нармальнай яе работы. Акрамя таго, загадчыцы сталовай № 33 Т. А. Трайновай рэкамендавана арганізаваць у інтэрнаце № 5 выдачу страў у адну чаргу з тым, каб пакупнікі рабілі разлік з касірам пасля поўнага набору страў, а не загадзя; а ў буфеце 6-га інтэрната ўстанавіць касавы апарат і выдзеліць дадаткова аднаго работніка ў дапамогу загадчыцы буфета.

Каб ліквідаваць вялікую цякучасць кадраў, адміністрацыі сталовай неабходна старанна прааналізаваць і ліквідаваць недахопы ў пасудамыечным цэху, дзе ўмовы працы з'яўляюцца яўна нездавальняючымі.

Вялікую дапамогу ў паляпшэнні работы сталовых і буфетаў павінна аказаць і адміністрацыйна-гаспадарчая частка універсітэта. У тэрміновым парадку неабходна ўвесці ў дзеянне буфет у інтэрнаце № 7 па вуліцы Кастрычніцкай, у якім жыве цяпер каля 2 тысяч студэнтаў. Памяшканне ж не падрыхтавана да адкрыцця ў ім буфета, ды і якіх-небудзь спроб у гэтым напрамку, відаць, не вядзецца. Чакае канкрэтнай дапамогі і буфет філалагічнага корпуса.

Вялікую трывогу выклікае работа буфета галоўнага корпуса БДУ, дзе выдача страў у хуткім часе па рашэнню санстанцыі можа быць даведзена да мінімуму, таму што бытавыя, службовыя і дапаможныя памяшканні тут вельмі маленькія, а колькасць пасадачных месц у зале яўна недастатковая. З-за цеснаты тут устаноўлена пліта малых размераў, якая не забяспечвае прыгатавання неабходнай колькасці страў; патрэбна таксама ўстаноўка дадатковага стала для прыгатавання халодных страў, шкафа для захоўвання чыстага посуду і г. д. З прычыны такой цеснаты ў буфеце дапускаюцца выпадкі парушэння правіл санітарыі і гігіены.

Гаспадарчай частцы універсітэта неабходна разгледзець магчымасці пашырэння варачнага, вытворчага, пасудамыечнага цэхаў і складскіх памяшканняў сталовай № 33 у сувязі са значным павелічэннем кантынгенту тых, хто харчуецца, а таксама аказаць дапамогу ў набыцці для сталовай неабходнай колькасці посуду.

Дзейсную дапамогу сталовым і буфетам прызваны аказаць камітэт камсамола, прафком і «Камсамольскі пражэктар», асабліва ў пытаннях арганізацыі дзяжурства ў буфеце галоўнага корпуса.

Відаць, ужо наспела неабходнасць увесці цэнтралізаваную сістэму грамадскага харчавання ва універсітэце, г. зн. замацаваць усе сталовыя і буфеты універсітэта за адной базавай сталовай. Гэта садзейнічала б паляпшэнню іх работы, правільнай і своечасовай дастаўцы прадуктаў і паўфабрыкатаў на канечныя пункты харчавання і рашэнню іншых важных пытанняў.

**Л. БЫЛІНА,**
кіраўнік сектара быту, намеснік старшыні групы народнага кантролю БДУ.

# ШТО, ДЗЕ, КАЛІ

**Зусім нядаўна раз'ехаліся на канікулы студэнты стацыянара, а на дзвярах аўдыторый зноў з'явіліся надпісы «Ціха! Ідзе экзамен!» Эстафету сесіі прынялі завочнікі.**

**⊙ У шасцікурснікаў сесія ўжо падышла к канцу. А вось у I—V курсаў хваляванні пачаліся толькі некалькі дзён назад.**

**Сёння прыйшлі на экзамен першакурснікі. Журналісты здаюць рускую літаратуру, будучыя біёлагі — уводзіны ў біялогію. 3 лютага ў адной з аўдыторый геафака збярэцца першы курс на экзамен па агульнаму землязнаўству. 7 лютага географам трэба будзе здаць залік па матэматыцы — і сесія для іх закончыцца.**

**⊙ Залікам па рускай літаратуры 18 студзеня пачалі зімовую сесію першакурснікі аддзялення беларускай мовы і літаратуры. Следам бяруць старт студэнты II і III курсаў. У іх экзамены па рускай літаратуры першай паловы XIX стагоддзя і па рускай літаратуры другой паловы XIX стагоддзя. 2 лютага ў корпусе па вуліцы Чырвонаармейскай студэнты зноў перагорнуць старонкі з гісторыі літаратуры — на гэты раз сучаснай, савецкай. Экзаменавацца будзе V курс аддзялення беларускай мовы і літаратуры.**

**А праз некалькі дзён — 4 лютага студэнты IV курса здаюць залік па рускай літаратуры XX стагоддзя.**

**2 лютага заканчваецца сесія ў студэнтаў-філолагаў VI курса. Апошні экзамен — тэорыя літаратуры.**

**Нялёгкім днём для трэцякурснікаў філфака будзе, напэўна, 8 лютага: у гэты дзень яны здаюць залік па лацінскай мове.**

**⊙ Якая праграма зімовай сесіі ў гісторыкаў! Большая частка экзаменаў і залікаў здадзена ў дні завочніка. Толькі ў пяцікурснікаў сесія будзе напружанай: 3 лютага — гісторыя новага часу (экзамен), а 7 лютага пачынаецца здача залікаў па спецсемінарах і экзаменаў па спецкурсах.**

**⊙ Параўнаўча лёгкай будзе гэтая сесія для студэнтаў I і II курсаў аддзялення філасофіі. Яны здаюць 8 лютага толькі па аднаму экзамену—вышэйшую матэматыку і логіку. У III курса гэтага аддзялення работы больш: два экзамены — гісторыя і тэорыя атэізму і асновы марксісцка-ленінскай філасофіі — і залік па гісторыі замежнай філасофіі.**

**⊙ На геафаку найбольш напружанай будзе сесія ў пяцікурснікаў. З 3 па 9 лютага групам фізічнай і эканамічнай геаграфіі належыць здаць экзамен па геаграфіі транспарту, эканамічнай геаграфіі СССР, залікі па дэшыфраванню, па фізічнай геаграфіі СССР, эканамічнай картаграфіі. Шасцікурснікаў найбольш хвалюе экзамен па гісторыі геаграфіі і геахіміі ландшафтаў.**

**⊙ Да ўвагі тых студэнтаў гістарычнага аддзялення, якія не паспелі здаць дысцыпліны ў дні завочніка: 1—8 лютага I курс здае гісторыю першабытна-абшчыннага ладу і асновы археалогіі. 3—8 лютага ў III курса экзамен па логіцы, а 1—2 лютага IV курс здае экзамен па педагогіцы.**

**⊙ 1—8 лютага ў галоўным корпусе праводзяцца заняткі па англійскай мове для студэнтаў аддзялення філасофіі і гісторыі, а ў юрыдычным корпусе—заняткі па французскай мове.**







*Вялікі практыкум па заалогіі пазваночных у студэнтаў VI курса аддзялення біялогіі.*
*Тэма заняткаў: прыгатаванне дэманстрацыйных матэрыялаў.*
Фота Д. ЧАХОВІЧА.





## ПОШТА ФАКУЛЬТЭТА

Больш двух тысяч пісьмаў атрымаў завочны факультэт у мінулым годзе. Акрамя заяў студэнтаў з просьбай перанесці па тых ці іншых прычынах экзамен ці залік, шмат пісьмаў прыходзіць з прадпрыемстваў і арганізацый, кіраўнікі якіх цікавяцца вучобай членаў сваіх калектываў. Факультэт пасылае адказ, такі, напрыклад, як у Віцебскі абком камсамола:

«На ваш запыт дэканат адказвае, што загадчык аргаддзела РК ЛКСМБ Я. Я. Варановіч займаецца на II курсе аддзялення філасофіі завочнага факультэта БДУ імя У. І. Леніна. Сесіі здае на добра і выдатна».

Тое ж гаварылася і аб студэнце VI курса аддзялення журналістыкі І. І. Мацюшонку. На жаль, прыходзіцца дасылаць і такія пісьмы:

«Рэдактару газеты «Кліч Радзімы» г. Шаркаўшчына Віцебскай вобласці паведамляем, што таварыш В. В. Мацук выключан з універсітэта ў лістападзе 1972 г. за невыкананне вучэбнага плана».

Цікавыя пісьмы прыходзяць ад тых, хто яшчэ толькі жадае вучыцца ва універсітэце. Вось што піша калгасны эканаміст Р. М. Скварцова з вёскі Варанцэвічы Віцебскай вобласці: «Я закончыла БСГА. Працую эканамістам у калгасе. Зразумела, што зараз без ведання заканадаўства спецыялісту вельмі цяжка працаваць. Таму хачу паступіць на юрыдычны факультэт».

Многа іншых пісьмаў прыходзіць у дэканат завочнага факультэта. І на кожнае з іх даецца своечасовы і дакладны адказ.

## *Памятка студэнту-завочніку*

# СКЛАДАЕМЫЯ

У гэтым артыкуле размова пойдзе аб складаемых поспеху ў вучобе, правах і абавязках студэнтаў-завочнікаў.

Вучэбным планам ва універсітэце прадугледжваецца штогод дзве лабараторна-экзаменацыйныя сесіі працягласцю 40 дзён (зімовая — 10 дзён, летняя — 30 дзён). Для студэнтаў аддзялення правазнаўства тэрміны сесіі ўстаноўлены: на I—II курсах па 15 дзён, на наступных — па 20 дзён.

Яўка студэнтаў на лабараторна-экзаменацыйныя сесіі і наведванне заняткаў строга абавязковы. У выпадку, калі студэнт не можа з'явіцца на сесію, ён абавязан да яе пачатку выслаць у адрас завочнага факультэта заяву з тлумачэннем прычын няяўкі. Да заявы неабходна прыкласці апраўдальны дакумент. Студэнт, які не прадставіў да пачатку сесіі заяву і апраўдальны дакумент, выключаецца з універсітэта.

Да чарговай экзаменацыйнай сесіі дапускаюцца толькі тыя студэнты, якія здалі ўсе залікі і экзамены за папярэдні вучэбны семестр і выканалі кантрольныя і курсавыя работы, прадугледжаныя планам бягучага семестра.

На лабараторна-экзаменацыйныя сесіі з захаваннем заработнай платы па месцу работы выклікаюцца студэнты, якія паспяхова выконваюць вучэбны план. Паспяхова выконваючымі вучэбны план лічацца тыя студэнты, якія не маюць акадэмічнай запазычанасці, у тэрмін і якасна выканалі кантрольныя (курсавыя) работы бягучага семестра.

Студэнтам, якія маюць акадэмічную запазычанасць або нясвоечасова выканалі кантрольныя (курсавыя) работы, высылаецца паведамленне аб тэрмінах правядзення лабараторна-экзаменацыйнай сесіі. У выпадку, калі студэнт па ўважлівых прычынах не мае магчымасці выканаць своечасова кантрольныя (курсавыя) работы, ён абавязан выслаць у адрас завочнага факультэта заяву з тлумачэннем прычын і просьбай прадоўжыць тэрмін выканання заданняў. Да заявы неабходна прыкласці апраўдальны дакумент.

Студэнты-завочнікі, якія паспяхова выконваюць вучэбны план, маюць права кожны год па месцу работы атрымаць дадатковы водпуск з захаваннем заработнай платы: на першых і другіх курсах — 30 каляндарных дзён; на наступных курсах — 40 каляндарных дзён. На перыяд падрыхтоўкі і абароны дыпломнай работы — 4 месяцы. Студэнты, якія здаюць толькі дзяржаўныя экзамены, атрымліваюць водпуск працягласцю 30 дзён. Для студэнтаў-выпускнікоў на перыяд дзесяці вучэбных месяцаў штотыднёва ўстанаўліваецца адзін свабодны ад работы дзень для падрыхтоўкі да заняткаў з аплатай у размеры 50 працэнтаў атрымліваемай заработнай платы. Акрамя таго, дазваляецца кіраўнікам прадпрыемстваў (устаноў) прадастаўляць па ўказаны перыяд дадаткова, па жаданню студэнтаў, яшчэ адзін-два свабодных ад работы дні ў тыдзень без захавання заработнай платы.

Прыбыўшы на экзамены і залікі, студэнт павінен мець пры сабе правераныя пісьмовыя работы і рэцэнзіі на іх. Прыходзіць на экзамены і залікі трэба строга па раскладу, маючы пры сабе заліковую кніжку. Калі студэнт не з'явіўся на залік або экзамен, выкладчык адзначае ў экзаменацыйнай ведамасці: «не з'явіўся», і ў выпадку няўважлівай прычыны выстаўляецца затым нездавальняючая ацэнка.

Пасля заканчэння сесіі студэнт абавязан вярнуць у метадычны кабінет усю вучэбна-метадычную літаратуру, атрыманую на завочным факультэце. Студэнтам, якія не вярнулі літаратуру, новая літаратура на наступны вучэбны семестр не выдаецца.

Студэнт можа вучыцца на кожным курсе толькі адзін год, на працягу якога ён абавязан здаць усе залікі і экзамены па дысцыплінах курса. Перавод на наступны курс пры наяўнасці акадэмічнай запазычанасці не дазваляецца.

Ліквідацыя акадэмічнай запазычанасці па ўважлівых прычынах дазваляецца ва ўстаноўленыя дэканатам тэрміны. За зімовую сесію—да 1 сакавіка бягучага года, за летнюю сесію — да 1 кастрычніка наступнага навучальнага года. Пры гэтым студэнт у абавязковым парадку павінен прадставіць у дэканат заяву з просьбай дазволіць ва ўстаноўлены тэрмін здаць акадэмічную запазычанасць. Студэнты, своечасова не ліквідаваўшыя акадэмічную запазычанасць, выключаюцца з універсітэта без папярэджання. У выпадку немагчымасці па ўважлівых прычынах (хвароба, камандзіроўка і г. д.) ліквідаваць акадэмічную запазычанасць ва ўстаноўлены тэрмін, студэнт абавязан выслаць у дэканат другую заяву аб прадаўжэнні тэрміну здачы экзаменаў і залікаў.

Да заявы павінны быць прыкладзены апраўдальныя дакументы.

Акадэмічны водпуск даецца толькі з прычыны хваробы пры наяўнасці заключэння ўрачэбнай камісіі. Заяву з просьбай аб прадастаўленні водпуску студэнт павінен выслаць у дэ-

# ДА ПАСЛУГ СТУДЭНТАЎ

Усяго два гады назад на завочным факультэце быў створан вучэбна-метадычны кабінет, а сёння гэта ўжо паўнапраўны аддзел, без якога цяжка ўявіць сістэму завочнага навучання. Праграмы курсаў, вучэбныя дапаможнікі, лекцыі, распрацоўкі — усё гэта, неабходнае студэнту-завочніку, ёсць у кабінеце.

Адкуль паступае такая літаратура?

— Вялікую дапамогу ў камплектаванні фонду метадычных распрацовак, кантрольных заданняў і г. д., — гаворыць загадчыца кабінета Т. Афанасенка, — аказвае вучэбна-метадычны кабінет пры Маскоўскім дзяржаўным універсітэце. Для завочнікаў-юрыстаў, напрыклад, прысылае літаратуру Усесаюзны юрыдычны завочны інстытут. Вядома, далёка не ўсе студэнты яшчэ забяспечваюцца такой літаратурай поўнасцю. Багацейшымі ў гэтых адносінах выглядаюць юрысты, філолагі, журналісты, бяднейшымі — гісторыкі. Дарэчы, аб вучэбнай літаратуры павінны паклапаціцца калектывы кафедр гістарычнага факультэта БДУ, якія пакуль што для завочнікаў выпускаюць вельмі мала неабходных дапаможнікаў. Маглі ж, напрыклад, паклапаціцца аб сваіх студэнтах кафедры філалагічнага факультэта: беларускай мовы, рускай савецкай літаратуры, зарубежнай літаратуры і іншыя.

Так, вялікую патрэбу адчуваюць у літаратуры студэнты-завочнікі. Тыя некалькі лекцый, што чытаюць ім у сесію, тая колькасць кніг, якія могуць дастаць яны ў бібліятэках, далёка не могуць іх задаволіць. Ім неабходны і грунтоўныя распрацоўкі лекцый, і метадычныя дапаможнікі, і спецыяльныя падручнікі па курсах. І гэта не павінны ўпускаць з поля зроку нашы выкладчыкі, кафедры, факультэты.

**А. ДЗЯШУК.**




На здымках: экзамен па навуковаму камунізму ў шасцікурснікаў-географаў прымае дацэнт І. У. Міронаў. Фота Д. Чаховіча.

*ТВАЕ ВЫКЛАДЧЫКІ, СТУДЭНТ*

# ВЫБАР ЗРОБЛЕН ДАЎНО

Біяграфія паэта Ніла Гілевіча звычайная для нашага часу: дзяцінства, у якім самымі светлымі ўспамінамі засталіся піянерскія кастры, Чапаеў на экране, пагранічнікі, потым будан у лесе, дзе хаваліся ад нямецкіх захопнікаў, а пасля вайны — напружаная вучоба, інтэрнат з яшчэ разбітымі вокнамі і студэнцкая дружба, мары аб будучым.

Ва універсітэт Ніл Сямёнавіч Гілевіч прыйшоў з Мінскага педвучылішча, якое закончыў на выдатна. Трапіўшы ў так званыя «пяць працэнтаў», ён атрымаў права паступіць ў вну без экзаменаў.

Выбіраць факультэт не трэба было — выбар быў зроблен даўно: толькі філфак, толькі аддзяленне роднай мовы і літаратуры. К таму часу Гілевіч ужо моцна быў прывязан да паэзіі, жыў і ў снах, і на яве з ёю, многа пісаў, зрэдку друкаваўся і, натуральна, на вучобу пайшоў туды, дзе, як яму здавалася, будзе бліжэй да літаратурнага асяроддзя.

— Прызнацца, — гаворыць сёння Н. С. Гілевіч, — ніякая іншая навука не вабіла мяне, ніякіх іншых захапленняў і схільнасцей, апроч як да паэзіі, у мяне не было.

Якім быў філфак на пачатку 50-х гадоў? Літаратурнае жыццё тут кіпела вавусю. Паэтаў—не злічыць: касякамі ходзяць па калідорах! Страсяні любога студэнта і напэўна вытрасеш вершы. Шчасцю майму не было межаў.

На лекцыях ішлі гарачыя спрэчкі, кожная падзея ў літаратурным жыцці атрымлівала самы жывы водгук сярод студэнтаў.

У БДУ Ніл Гілевіч знаёміцца з У. Нядзведскім, Г. Кляўко, А. Лойкам, А. Вярцінскім, М. Арочкам, В. Тарасам і іншымі маладымі паэтамі, якія складалі творчае ядро і фактычна задавалі тон усяму літаратурнаму жыццю факультэта.

У сувязі з 30-годдзем універсітэта на факультэце праводзіўся конкурс на лепшае апавяданне, верш, нарыс. Журы конкурсу ў складзе прафесара І. В. Гутарава, паэта Пятра Глебкі, літаратурнага крытыка Івана Кудраўцава, разгледзеўшы паступіўшыя на конкурс творы, вылучыла тры лепшыя, сярод якіх быў і верш студэнта першага курса Ніла Гілевіча. За верш «На парозе жыцця» ён атрымаў другую прэмію. Малады паэт расказвае аб тым новым жыцці, якое пачалося для яго:

Жартавалі некаторыя:
Не сумуй па дому, брат!
Новы дом — аўдыторыя
І вясёлы інтэрнат.

На трэцім — пятым курсах Ніл Гілевіч многа піша і даволі часта друкуецца ў «Полымі», «Маладосці», «Беларусі», «Вожыку», «ЛІМе».

У 1954 годзе студэнта трэцяга курса Ніла Гілевіча прынялі ў члены Саюза пісьменнікаў СССР. Пачынаючаму паэту хацелася ўдзельнічаць у розных пісьменніцкіх сходах, гутарках, цягнула ў рэдакцыі газет і часопісаў...

Назаўсёды засталося ў памяці студэнта святкаванне 70-годдзя з дня нараджэння Якуба Коласа, на якім яму давялося выступаць з прывітаннем юбіляру. Ніл Гілевіч быў тады на другім курсе. Ён прачытаў два вершы: адзін, напісаны па матывах коласаўскага «Асадзі назад», і другі, прысвечаны юбіляру непасрэдна. Вершы Коласу вельмі спадабаліся, ён горача паціснуў юнаку руку, падзякаваў і пахваліў. Гэта пахвала да глыбіні душы ўсхвалявала і надоўга зрабіла яго шчаслівым і акрылёным.

У 1956 годзе Ніл Гілевіч заканчвае універсітэт і з усёй сур'ёзнасцю і адказнасцю аддаецца творчай працы. Верш за вершам выходзіць з-пад яго пяра. Свае веды, вопыт, хваляванні ён хоча данесці да сэрцаў чытачоў. Паэт піша:

Люблю цябе, жыццё,
любоўю кроўнай.
Я не нахлебнік твой.
Я на зямлю
Не для таго прыйшоў, каб
жменяй поўнай
Уцехі браць. Я аддаваць
люблю.
Тым, што зрабіў, любоў
я вымяраю,
І калі мой апошні час
праб'е,
Павінен ведаць я, што
паміраю,
Аддаўшы ўсё да
кропелькі — табе.

Першая кніжка паэта была выдадзена ў 1957 годзе. У ёй бачым лірычнага героя, улюбёнага ў жыццё, які імкнецца знайсці сваё месца ў буднях сучаснасці. Асабліва сардэчныя адносіны ў аўтара да людзей, якія блізкія яго душы, у першую чаргу — да студэнтаў.

Другая кніга Гілевіча «Прадвесне ідзе па зямлі» паглыбляе і пашырае асноўныя матывы папярэдняга зборніка. Перад намі ранейшы юнак, за спіной якога незабыўныя гады студэнцкай дружбы.

З кожным годам вершы паэта становяцца ўсё больш глыбокімі і змястоўнымі. З друку выходзяць усё новыя кніжкі Н. Гілевіча.

Выходзяць у свет зборнік лірычных вершаў «Неспакой», кнігі сатыры і гумару «Званковы валет» і «Да новых венікаў», некалькі кніжак вершаў для дзяцей.

У 1959 годзе Н. Гілевіч, у той час ужо выкладчык універсітэта, выдае кнігу «Акрылёныя рэвалюцыяй» — даследаванне пра маладую беларускую савецкую паэзію 20-х гадоў. Праца атрымала высокую ацэнку крытыкі.

Ніл Гілевіч вядомы таксама як перакладчык на беларускую мову балгарскіх паэтаў і празаікаў. Лепшым са сваіх перакладаў паэт лічыць зборнік сучаснай балгарскай паэзіі «Ад стром балканскіх». За перакладчыцкую дзейнасць урад НРБ узнагародзіў Н. С. Гілевіча ордэнам Кірылы і Мяфодзія.

Н. С. Гілевіч звязаў свой лёс з родным універсітэтам. Ён—кандыдат філалагічных навук, выкладае беларускі фальклор і літаратуру, выдаў некалькі даследаванняў пра беларускую народную песню. Зараз студэнты пад яго кіраўніцтвам рыхтуюць да друку трохтомнае выданне беларускага фальклору ва ўласных запісах.

— Працаваць у родным універсітэце для мяне — і вялікая радасць, і высокі гонар, — гаворыць Ніл Сямёнавіч. — Тым больш працаваць у такім калектыве, як кафедра беларускай літаратуры, дзе сабралася столькі актыўна творчых людзей, пісьменнікаў і літаратуразнаўцаў. І працаваць на такім факультэце, як філалагічны, дзе выхоўваюцца не толькі педагогі, але і свядомыя дзеячы нацыянальнай літаратуры і культуры, дзе столькі слаўнай моладзі, шчыра ўлюбёнай у родную песню, у родны бацькоўскі край.

**Л. АЎГУСЦІНОВІЧ,**
**член гуртка тэорыі і гісторыі беларускай літаратуры.**

# ПОСПЕХУ

канат завочнага факультэта да пачатку экзаменацыйнай сесіі. Пасля сесіі пытанне аб прадастаўленні водпуску дэканатам не разглядаецца, а студэнт, які своечасова не аформіў акадэмічны водпуск, выключаецца з універсітэта.

Пасля заканчэння акадэмічнага водпуску неабходна выслаць у дэканат заяву і даведку ўрачэбнай камісіі аб тым, што па стану здароўя яму дазваляецца працягваць вучобу ва універсітэце.

Студэнт абавязан кожны год к летняй сесіі прадстаўляць у дэканат даведку з месца работы. Тыя, хто не прадставіць такой даведкі, да сесіі не дапускаюцца.

Пры перамене месца жыхарства трэба неадкладна паведаміць аб гэтым у дэканат і бібліятэку універсітэта і ўказаць свой новы адрас і паштовы індэкс.

Кантрольныя і курсавыя работы ў перыяд сесіі не прымаюцца і не рэцэнзуюцца. Студэнты-завочнікі, не атрымаўшыя заліку па ўсіх кантрольных работах да пачатку сесіі, да здачы экзаменаў і залікаў не допускаюцца.

Пры адпраўленні ва універсітэт пісем, кантрольных работ і іншай карэспандэнцыі студэнт павінен абавязкова ўказаць:

а) сваё прозвішча, імя і імя па бацьку;

б) аддзяленне і курс, на якім вучыцца;

в) дамашні адрас і паштовы індэкс;

г) на вокладцы кантрольных работ указваецца дадаткова назва дысцыпліны і нумар кантрольнай работы.

Студэнт, які не здаў у сесію залікі і экзамены па трох і больш дысцыплінах, выключаецца з універсітэта.

Студэнты, прыбыўшыя на лабараторна - экзаменацыйную сесію, павінны ў абавязковым парадку зарэгістравацца ў канцылярыі завочнага факультэта да пачатку заняткаў. У час сесіі студэнт абавязан строга выконваць правілы ўнутранага распарадку ва універсітэце.

Пасля зімовай сесіі студэнт абавязан з'явіцца да метадыста для зверкі выканання вучэбнага плана за бягучы семестр і пасля летняй сесіі для зверкі выканання вучэбнага плана за ўвесь навучальны год і афармлення пераводу на наступны курс.

Студэнты-завочнікі карыстаюцца бібліятэкай універсітэта на агульных асновах. Вучэбная і навуковая літаратура, як правіла, выдаецца на вучэбны семестр.

Студэнт абавязан беражліва адносіцца да атрыманых кніг і своечасова вяртаць іх. Калі ж кніга згублена, трэба пастарацца набыць для бібліятэкі такую ж або раўнацэнную. У адваротным выпадку кошт кнігі спаганяецца ў пяцікратным размеры.

Дэканат завочнага факультэта звяртае ўвагу на тое, што толькі сістэматычная і планавая работа студэнта на працягу ўсяго навучальнага года дае яму магчымасць добра засвоіць вывучаемыя прадметы і паспяхова здаць экзамены і залікі. Дэканат рэкамендуе актыўна выкарыстоўваць усе формы міжсесійнай работы — падтрымліваць пастаянную сувязь з кафедрамі, з выкладчыкамі, наведваць тэматычныя і індывідуальныя кансультацыі, а ў выпадку немагчымасці іх наведвання атрымліваць у выкладчыкаў пісьмовыя кансультацыі, актыўна выкарыстоўваць дні завочніка, якія праводзяцца адзін раз у месяц па суботах.

Будучы на сесіі, студэнт павінен атрымаць у выкладчыкаў і метадыстаў указанні па выкананню вучэбнага плана на наступны навучальны семестр.

**ДЭКАНАТ.**

# ВЫ ПРЫЙШЛІ Ў ІНТЭРНАТ...

Тым, у каго сесія пачынаецца 31 студзеня, прадастаўляецца месца ў інтэрнаце. Прыходзяць завочнікі і да нас. З вопыту мінулых год магу сказаць, што не заўсёды гэты прыход бывае радасным для адміністрацыі інтэрната, ды і для студэнтаў стацыянара, якія пасля канікул знаходзяць у сваіх пакоях горы смецця, бітае шкло, брудную падлогу і г. д. Таму хочацца даць некалькі парад студэнтам-завочнікам.

Па-першае, не забудзьце ўнесці ў касу плату за інтэрнат, прайсці медагляд. У каменданта вы атрымаеце пропуск і ключ ад пакоя, калі вас назначаць старастай.

Вы атрымалі месца ў пакоі, дзе ўсё чыста і на сваім месцы. Пастарайцеся здаць яго ў такім жа выглядзе.

Нельга забываць і аб правілах унутранага распарадку ў інтэрнаце. Помніце, што побач з вамі жывуць вашы таварышы. Не забывайце рэгулярна прыбіраць пакой, прытрымлівацца парадку ў грамадскіх месцах (кухнях, душавых, умывальніках, пакоях для мыцця бялізны).

Пры ад'ездзе не забудзьце забраць свае дакументы.

Жадаем вам паспяхова здаць сесію!

**У. СЦЯПАНАЎ,**
**камендант інтэрната № 4.**

# З ПЕРШАГА І ДА ШОСТАГА

**ПАЧАТАК**

Ад яго залежыць, як складзецца тваё далейшае жыццё, асабліва калі гэта — пачатак вучобы ва універсітэце.

Сёння яны здаюць апошні ў гэтую сесію экзамен — арганізацыя суда і пракуратуры. Абставіны, якія звычайна бываюць у час экзамена: нехта хвалюецца, іншы раўнадушна пазірае ў акно. Яны — чацвёртая група І курса юрыдычнага аддзялення. Завочнікі. Старая, як свет, карціна экзаменаў. Усё проста, і ці адзін яшчэ экзамен будзе! Але...

У гутарцы з Ізабелай Іванаўнай Марціновіч, якая прымае сённяшні экзамен, выявілася, што вельмі многа здавальняючых адзнак, што многія ў адказах не ідуць далей падручніка, а хтоніхто нават і падручнік не паспеў прачытаць.

Слаба, вяла, няўпэўнена адказваюць Генадзь Гур і Анатоль Каравацкі, а Хрысціну Жораву і зусім слухаць не хочацца: і мова дрэнная, і ведаў няма. А за дзвярыма яна радасна абвясціла аб сваім «здавальняюча» і дадала пры гэтым:

— А мне больш і не трэба было.

Больш, як «тры», мне і не трэба, завочніку хопіць і «дзяржаўнай», нам жа стыпендыя не патрэбна. Такія словы можна было пачуць каля аўдыторыі № 36.

Дык вось адкуль такія сумныя адказы! На «тройку», маўляў, хопіць.

А вось у Леаніда Данілевіча і жаданне ёсць, а часу не хапае. Прызнаўся нават хлопец, што ўжо 12 дзён спіць толькі па тры гадзіны. Ён з захапленнем расказвае пра сваіх сяброў, знаёмых, пра сваю працу ў міліцыі. Але нават у тым, як гаворыць, відаць, што самае вялікае яго жаданне зараз — лягчэй і добра-такі выспацца.

Нялёгкім быў у Лёні гэты этап — першы семестр першага курса. Не ведаў, як час правільна размеркаваць, што вучыць у першую чаргу, не ведаў, што можна некаторыя прадметы здаваць датэрмінова. Цяжка цяпер — лягчэй будзе пасля. Лёня верыць, што ўсе праблемы пры жаданні можна вырашыць. А калі будзе яно, хопіць часу і на газеты, і на дадатковую літаратуру, і на кіно. Лёня Данілевіч ужо цвёрда вырашыў, што падрыхтоўку да будучай сесіі ён пачне адразу ж, не адкладваючы ўсё на апошнія дні.

**ШТРЫХІ ДА ПАРТРЭТА**

Для Валерыя Рыжых гэтая зімовая сесія — перадапошняя ў яго студэнцкім жыцці. Здаецца, зусім нядаўна, пасля службы ў арміі паступіў ён на аддзяленне геаграфіі завочнага факультэта БДУ. Тады ж, у 1967 годзе, стаў працаваць інструктарам Стаўбцоўскага райкома камсамола. Цяпер ён — другі сакратар, выпускнік універсітэта. Даўно мінуў той час, калі не ведаў, за што найперш узяцца: працаваць, чытаць падручнік ці бегчы на спатканне. Цяпер усё стала на сваё месца. Часам нават пачынае здавацца, што гэта проста суткі сталі большымі. Праўда, цяжкавата бывае і зараз, работы заўсёды хапае. Але як бы там ні было, у яго залікоўцы заўсёды толькі добрыя і выдатныя адзнакі.

Экзамен. Пад дзвярыма натоўп. Дзяўчаты нешта ўсхвалявана абмяркоўваюць. Адна з іх пазірае праз шчыліну дзвярэй у аўдыторыю і каменціруе ўголас:

— Дзяўчаткі, Валера Рыжых ідзе адказваць. Ну, гэты не падкачае.

А калі ён выходзіць, віншуюць, распытваюць.

Невысокі, светлавалосы, з камсамольскім значком на грудзях. Зусім звычайны на першы погляд хлопец. Але адчуваецца ўсё ж у ім нейкая ўнутраная напорыстасць, якая робіць яго твар валявым і выклікае сімпатыю.

— Як я ўсё паспяваю рабіць?.. — Валерый на хвіліну задумваецца.

— Перш за ўсё, камсамольская работа не дае засядзецца, абавязвае бачыць і ведаць вельмі многа. Ну, а пасля, галоўнае — ясна акрэсліць сваю мэту і імкнуцца да яе праз усе перашкоды.

— Мой любімы занятак у вольны час? Люблю кінаапаратуру. Ужо зняў некалькі «сямейных» фільмаў. І яшчэ гуляць з сынам, якому хутка споўніцца 2 гады.

**Л. ПЕРАСЫПКІНА.**

*Уступную лекцыю па крымінальнаму працэсу завочнікам IV курса юрыдычнага факультэта чытае дацэнт Веніямін Мікалаевіч ШПІЛЕЎ.*

Фота Д. ЧАХОВІЧА.





# 11-я І АПОШНЯЯ

*Аб сваіх аднакурсніках, іх настроі і клопатах у дні зімовай апошняй сваёй сесіі расказвае староста групы эканамічнай геаграфіі VI курса геаграфічнага аддзялення Эмілія ДУБРОВІНА.*

Нас 26. Вось ужо шосты год збіраемся мы ва універсітэце на экзаменацыйныя сесіі. Цяперашняя — апошняя. Папярэднія 10 сесій — 10 сустрэч, якія зблізілі нас, згуртавалі, і таму крыху засмучае хуткае развітанне.

Наш калектыў складаюць людзі з розных раёнаў Беларусі. У асноўным усе працуюць настаўнікамі. У г. Асіповічы настаўнічае Р. Самусевіч, у Брэсцкай вобласці — В. Грышчук, у інтэрнаце г. Іўе працуе Т. Буланчыкава. Пасля кожнай сесіі раз'язджаецца група па ўсёй Беларусі. Але сувязі не парываюцца. 26 пунктаў на тэрыторыі Беларусі працягваюць жыць сумесна, аднымі планамі, клопатамі. Многіх з нас звязвае моцная дружба, якая пачалася іменна ў час вучобы. Яна, напэўна ж, будзе жыць і пасля атрымання дыпломаў. Пісьмы, абмен падручнікамі — гэта яшчэ не ўсё. Той, хто працуе ў школе, рад выпадку зайсці на заняткі да калегі, пераняць вопыт, падзяліцца сваім, як, напрыклад, Марыя Пазняк і Ганна Скібіцкая, якія працуюць у школах Зельвенскага раёна.

Звычайна сесіі здаем роўна. Бываюць «завалы» — не без іх, але ўвогуле студэнты сур'ёзна адносяцца да вучобы. У нас ёсць з каго браць прыклад. З году ў год рос аўтарытэт Н. Ісакавай, Р. Самусевіч, Т. Буланчыкавай. Усе сесіі яны здавалі паспяхова. Спадзяемся, што і ў гэтую сесію яны не падвядуць, а іншыя пастараюцца не адстаць.

Вучоба і праца. Яны дапамагаюць адно аднаму, своеасабліва дапаўняюць. Зразумела, што значаць веды, атрыманыя ў БДУ за пяць год, для тых з нас, хто цяпер працуе або збіраецца прысвяціць сваё жыццё школе. Сёння ён слухае лекцыі, а праз некалькі дзён у сваім класе паспрабуе данесці да школьнікаў тыя багацці, якія атрымаў у час вучобы.

Наперадзе ў нас — дыпломная работа. Мы ўдзячны нашым выкладчыкам за іх лекцыі, кансультацыі, парады.

Тое, як будзе здадзена сесія ў студэнта-завочніка, залежыць ад раду абставін. Напэўна, самае балючае — праблема жылля. У нас сесія пачалася 15 студзеня, калі яшчэ здавалі экзамены студэнты стацыянара. У інтэрнатах месц не было. Кватэру адразу знайсці цяжка. Многім з нашых студэнтаў даводзіцца жыць за горадам, трацячы штодзённа каля 4 гадзін на дарогу. Можа, варта было б пастаянна трымаць у дэканаце адрасы кватэраздатчыкаў, каб у час сесіі прапанаваць іх студэнтам? Нас, шасцікурснікаў, гэта хвалюе і таму, што з сакавіка на працягу чатырох месяцаў наш курс будзе працаваць над дыпломамі. Для тых, хто не жыве ў Мінску, праблема жылля будзе стаяць вельмі востра.

Што яшчэ хвалюе і хвалявала на працягу пяці год? Недахоп падручнікаў. Каб забяспечыць сябе кнігамі, трэба было думаць аб гэтым за некалькі сесій і пачынаць збіраць іх. І яшчэ некалькі слоў аб нашай педагагічнай практыцы пасля IV курса. Многія працуюць не ў школе і з педагагічнай работай сутыкаліся ўпершыню. Не ўсе атрымалі сапраўднае творчае задавальненне ад яе. І няўдалай яшчэ была практыка ў большасці выпадкаў таму, што не знайшлося таварыша, які б дапамог зрабіць працу цікавай.

# ПРАВІЛЫ НЕАБХОДНА ПАДТРЫМЛІВАЦЬ

Бібліятэка БДУ — адна з буйнейшых у рэспубліцы. Яе фонд складае больш мільёна тамоў. Акрамя студэнтаў стацыянарнага і вячэрняга аддзяленняў, бібліятэкай карыстаюцца каля 3650 завочнікаў, для якіх цяпер пачалася адказная пара — зімовая экзаменацыйная сесія.

У распараджэнні студэнтаў-завочнікаў ёсць фонды дамашняга абанемента, кнігасховішча, чытальнай залы і шматлікіх кабінетаў.

Завочнікі таксама маюць магчымасць звярнуцца за кансультацыяй у алфавітны каталог, даведніцка - бібліяграфічны аддзел, дзе вопытныя работнікі дапамогуць ім хутка знайсці патрэбную кнігу.

У выніку намаганняў усіх супрацоўнікаў бібліятэкі студэнты своечасова будуць забяспечаны кнігамі па асноўных дысцыплінах. У 1972 годзе толькі па дамашняму абанементу завочнікі атрымалі больш 50.000 тамоў, у дапаўненне ім па пошце быў выслан 1821 экземпляр кніг. У гэтым годзе выдача кніг не паменшыцца. Але бяда ў тым, што мы часта не можам задаволіць патрабаванні па віне завочнікаў - даўжнікоў. Многія студэнты трымаюць найбольш дэфіцытныя кнігі па 2—3 і больш гадоў і гэтым падводзяць сваіх жа таварышаў па вучобе.

Нягледзячы на тое, што пры запісе ў бібліятэку нашы супрацоўнікі знаёмяць кожнага студэнта з правіламі карыстання фондам, у якіх указана, што бібліятэчная кніга павінна быць своечасова вернута, толькі на дамашнім абанеменце цяпер 206 даўжнікоў. Сярод іх:

**студэнты - філолагі** В. І. Сатнічэнка (6 кніг з 1969), Н. І. Рачкоўская (3 кнігі з 1969), У. С. Касянюк (16 кніг з 1969), А. С. Вакула (4 кнігі з 1969), П. М. Ліпай (8 кніг з 1968);

**матэматыкі** Г. П. Бортнік (8 кніг з 1970), А. М. Гуткін (11 кніг з 1970).

**біёлагі** Т. В. Вінаградава (3 кнігі з 1968), А. І. Шостак (8 кніг з 1969), З. М. Скарапанава (7 кніг з 1969), Н. А. Ільеў (6 кніг з 1968);

**географы** М. Ф. Пакладок (5 кніг з 1969), А. В. Ханенка (4 кнігі з 1969), Л. М. Пракапчук (7 кніг з 1970), Б. М. Шаўчэнка (3 кнігі з 1969);

**гісторыкі** Л. І. Зубко (7 кніг з 1970), В. І. Фрэлоў (не вярнуў падручнік па археалогіі, узяты яшчэ ў 1969 годзе) і г. д.

Вялікую карысць завочніку ў час экзаменацыйнай сесіі аказвае работа ў чытальнай зале. Аднак і там ён можа не знайсці патрэбную кнігу, таму што і там правіла здаваць кнігу ў той жа дзень часта парушаецца. У ліку парушальнікаў студэнты **філалагічнага аддзялення** Н. С. Валодзькіна (3 кнігі), А. М. Грабоўская (3 кнігі), С. П. Янкоўская; **журналісты** Л. Н. Новікава, М. І. Івашкевіч, Л. М. Тупысевіч (4 кнігі).

Гэты спіс можна яшчэ прадоўжыць.

У заключэнне хачу сказаць, што работнікі бібліятэкі зробяць усё магчымае для таго, каб лепш забяспечыць кнігамі студэнтаў-завочнікаў у час гэтай сесіі, але і завочнікі абавязаны строга падтрымліваць правілы карыстання бібліятэкай.

**А. ДРАЗДОЎСКІ,**
**супрацоўнік бібліятэкі.**

*У дэканат завочнага факультэта часта прыходзяць пісьмы ад студэнтаў з просьбай адказаць на тое ці іншае пытанне. Рэдакцыя папрасіла намесніка дэкана М. А. Майракава адказаць на некаторыя з іх.*

# ВЫ ПЫТАЕЦЕСЯ...

**Якія льготы прадастаўляе Аэрафлот студэнтам-завочнікам?**

Міністэрства грамадзянскай авіяцыі СССР увяло ў дзеянне з 1 кастрычніка 1970 года сезонныя скідкі з тарыфаў у размеры 50 працэнтаў для тых, хто вучыцца на дзённых аддзяленнях вну. З 1 студзеня 1971 года дзеянне гэтага загаду распаўсюджваецца на студэнтаў вну вячэрніх і завочных аддзяленняў.

Ільготныя авіябілеты са скідкай 50 працэнтаў прадаюцца студэнтам пры прад'яўленні студэнцкага білета. Акрамя таго, асобы, якія вучацца без адрыву ад вытворчасці, павінны прад'явіць даведку з месца работы аб прадастаўленым водпуску.

Тэрмін заканчэння дзеяння льгот устаноўлен 31 мая (за некаторымі выключэннямі).

**Ці можна, здаўшы экзамены ў вольны ад работы час, выкарыстаць вучэбны водпуск для адпачынку?**

Нельга. Гэта незаконна, таму што вучэбны водпуск мае сваё назначэнне і даецца не для адпачынку. Па той жа прычыне студэнты-завочнікі не маюць права на нявыкарыстаныя дні вучэбнага водпуску пры датэрміновай здачы экзаменаў.

**Ці можна перавесціся ў іншую вну?**

У адпаведнасці з існуючым палажэннем перавод здзяйсняецца толькі ў аднатыпныя вну да пачатку навучальнага года (ліпень — жнівень) пры паспяховым выкананні вучэбнага плана за курс і пры згодзе абодвух рэктараў.

**Ці дазваляецца здача экзаменаў і залікаў на кансультацыйных пунктах пры розных вну?**

Да вучэбна-кансультацыйных пунктаў прымацоўваюцца студэнты завочнага факультэта, якія жывуць у раёне гэтага пункта. Студэнтам-завочнікам БДУ дазваляецца атрымліваць на іх кансультацыі, слухаць аглядныя лекцыі, карыстацца вучэбнай літаратурай. Здача залікаў і экзаменаў праводзіцца толькі на завочным факультэце БДУ.

Рэдактар А. А. НІКОЛЕНКА.

Наш адрас: г. Мінск, універсітэцкі гарадок, галоўны корпус, п. 106. Тэлефон — 22-07-19.
Ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга друкарня выдавецтва ЦК КП Беларусі. Тыраж 2.000 экз. АТ 05052 Заказ 109.